**В.У. Мазанік**

## *Дырыжоры Дзяржаўнага акадэмічнага народнага аркестра Рэспублікі Беларусь імя І.Жыновіча*

Гэты артыкул прысвечаны пытанням развіцця дырыжорскага мастацтва 30—60-х гг. у народна-інструментальнай музыцы. Паколькі асобныя факты па гэтай праблеме не атрымалі належнага аналізу ў спецыяльнай літаратуры, наша задача — абагульненне працэсаў, якія адбываліся ў развіцці народна-інструментальнага аркестравага выканальніцтва і дырыжорскага мастацтва, частковае дапаўненне існуючых звестак, высвятленне некаторых бакоў пытання ўзаемасувязі аркестравага выканальніцтва і дырыжорскага мастацтва. У дадзеным артыкуле мы разглядаем аркестравае дырыжорскае мастацтва як сукупнасць узаемадзеяння дырыжора і аркестравага калектыву, сумесную працу дырыжора і аркестра ў іх арганічным адзінстве на прыкладзе дзейнасці Дзяржаўнага аркестра народных інструментаў імя І.І. Жыновіча.

Можна знайсці шмат матэрыялаў (артыкулы, рэцэнзіі, водгукі на канцэрты і г.д.) аб творчым шляху гэтага вядомага, прызнанага калектыву. Па заслугах ацэнена праца выдатных майстроў сваёй справы — народнага артыста СССР, прафесара І.І.Жыновіча; народнага артыста Рэспублікі Беларусь, прафесара М.А.Казінца. Цяперашні Дзяржаўны аркестр народных інструментаў — гэта вынік шматгадовай працы музыкантаў розных пакаленняў: выканаўцаў, дырыжораў, кампазітараў. Але некаторыя дасягненні патрабуюць больш пільнага аналізу і дадатковага вывучэння.

Мы разгледзім дзейнасць дырыжораў, якіх часцей звязваюць з сімфанічным аркестрам, з операй, але менавіта яны ў розныя гады ўнеслі важкі ўклад у развіццё аркестра беларускіх народных інструментаў. Гэта народны артыст СССР К.А.Сіміяонаў і заслужаны дзеяч мастацтваў РСФСР В.Н.Барсаў. Перыяд іх працы на Беларусі малавядомы. Між тым паспяховая творчая дзейнасць гэтых выканаўцаў у розных музычных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

накірунках свелчыць аб шматграннасці прафесіі дырыжора, дазваляе выявіць прафесійныя якасці, неабходныя для работы з аркестравым калектывам. Нельга недаацэньваць таксама і карысць, якую прынесла ў народна-інструментальнае выканальніцтва дзейнасць музыкантаў з мысленнем і інтэлектам сімфанічных дырыжораў.

У 1937 г. адбылася значная з'ява ў мастацкай культуры Беларусі — нацыянальны аркестр народных інструментаў увайшоў у склад Беларускай дзяржаўнай філармоніі, "у яго ўліліся лепшыя выканаўцы на беларускіх інструментах, а першым дырыжорам стаў К.Сімяонаў" (1). Падмуркам для стварэння беларускага аркестра народных інструментаў стаў аматарскі калектыў Д.А.Захара. Яго нараджэннем лічыцца 1928 год, калі адбыўся вялікі канцэрт беларускай народнай музыкі ў Мінску ў клубе імя К.Маркса. Потым аркестр пераўтвараецца ў Беларускі дзяржаўны ансамбль народных інструментаў, афіцыйнае стварэнне якога зацверджана пастановай Наркамасветы БССР у снежні 1930 года. "Так упершыню ў гісторыі музычнай культуры рэспублікі пачаў сваю дзейнасць новы нацыянальны прафесійны калектыў" (2).

Стваральнікам першага беларускага аркестра народных інструментаў быў Д.А.Захар (1898 — 1951), які на працягу некалькіх гадоў заставаўся адзіным мастацкім кіраўніком калектыву. "...Малады, перапоўнены бурлівай энергіяй, усебакова адораны чалавек, закаханы ў тэатр, музыку, саліст-віртуоз на балалайцы, неперамржны выканаўца камічных роляў у спектаклях, — разам з тым: спявак, танцор і нястомны арганізатар" (3), — так ярка характарызуе таленавітага музыканта ў артыкуле "Залатыя струны" народная артыстка СССР Л.П.Александроўская, з якой нямала працаваў Д.Захар. Як піша славутая спявачка, яны былі разам ад вытокаў, калі ў склад ансамбля ўваходзілі трынаццаць чалавек: дванаццаць музыкантаў і маладая спявачка Л.Александроўская, якая толькі пачынала свой творчы лёс. Выконваючы інструментальную музыку — апрацоўкі беларускіх народных песень і танцаў, — калектыў з поспехам выступаў у ролі акампаніятара.

Творчую дзейнасць аркестра народных інструментаў нельга разглядаць асобна ад працэсаў, якія адбываліся ў гэты час у мастацкай культуры рэспублікі. Музычнае мастацтва ішло па прафесійным шляху развіцця, і калектыў Д.Захара аказаў вялікі ўплыў як на развіццё самадзейнай музычнай творчасці, так і на станаўленне прафесійнага народна-

інструментальнага мастацтва Беларусі. І тут трэба гаварыць аб ролі ў гэтым працэсе менавіта музыканта-першапраходца Д.А.Захара. Яму "...належыць слава першага прапагандыста цымбалаў, шырокага выкарыстання іх — гэта яго заслуга, яго тварэнне" (4).

Дзякуючы таму, што выканальніцкі ўзровень калектыву быў даволі высокі, ён арганічна ўвайшоў у склад філармоніі. Гэта садзейнічала далейшаму яго прафесійнаму развіццю. За канцэртна-выканальніцкай дзейнасцю аркестра ўважліва сачылі музычная грамадскасць, аматары народна-інструментальнай творчасці, яго выступленні адлюстроўваліся на старонках перыядычнага друку ў рэцэнзіях, паведамленнях. Так з'явіліся станоўчыя водгукі аб удзеле аркестра беларускіх народных інструментаў у канцэртах Усесаюзнага радыёкамітэта для Далёкага Усходу (5), аб гастролях у Маскве, дзе беларускія музыканты далі звыш дзесяці канцэртаў, адзін з якіх адбыўся ў Калоннай зале Дома саюзаў, другі — у Вялікай зале кансерваторыі (6). Газета "Савецкая Беларусь" паведамляла аб тым, што дырыжор аркестра Р.Ф.Самохін (некаторы час аркестрам кіраваў кампазітар Р.Ф.Самохін. — *В.М.*) дабіўся ад аркестра добрага ансамбля і даволі высокай выканальніцкай тэхнікі, асабліва ў цымбалістаў (7). Але ж галоўнае сваё прызначэнне артысты бачылі ў служэнні мастацтву на Радзіме, у шматлікіх канцэртах паказвалі высокае выканальніцкае майстэрства (8).

Рэпертуар Дзяржаўнага аркестра беларускіх народных інструментаў складаўся ў асноўным з апрацовак беларускіх народных песень і танцаў. І вось беларускімі кампазітарамі былі зроблены першыя крокі ў пашырэнні рэпертуару аркестра. Так, спецыяльна для аркестра Р.Самохіным было напісана "Рондо", народная музыка гучала ў апрацоўках прафесійных кампазітараў М.Шчаглова і А.Туранкова.

Надышоў момант, калі сур'ёзна паўстала пытанне аб пастаянным, штатным дырыжоры Дзяржаўнага аркестра беларускіх народных інструментаў. Справа ў тым, што любы прафесійны калектыў патрабуе выпрацоўкі стратэгічных накірункаў мастацкага развіцця, і гэтая задача, як правіла, ускладаецца на мастацкага кіраўніка аркестра. У 1937 г. сімфанічны аркестр беларускай філармоніі ўзначаліў на той час ужо вядомы ленінградскі дырыжор І.А.Мусін, які ў якасці другога дырыжора прапанаваў свайго вучня К.А.Сімяонава. Як успамінаў І.А.Мусін: "Дырэкцыя пагадзілася з прапановай запрасіць майго вучня К.Сімяонава,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

які працаваў год дырыжорам Петразаводскай філармоніі. К.Сімяонаў, які стаў у пасляваенныя гады народным артыстам СССР, выдатна дапамагаў у рабоце"(9).

Дэбютам у Мінску для К.А.Сімяонава сталі канцэрты Дэкады рускай класічнай музыкі ў 1938 г., якія праводзіліся з мэтай знаёмства слухачоў з лепшымі ўзорамі класічных твораў. Першыя канцэрты пад кіраўніцтвам К.Сімяонава адзначаліся прэсай. Па водгуках сучаснікаў, малады дырыжор з поспехам правёў канцэрты, паказаўшы сябе таленавітым музыкантам. "Пад яго кіраўніцтвам аркестр жыве паўнакроўным жыццём, выкананая ім 4-я сімфонія, "Франчэска" П.І. Чайкоўскага прагучалі ярка, цікава, свежа, з уздымам і эмацыянальна" (10).

Трэба адзначыць, што менавіта канцэртная дзейнасць раскрывае творчае аблічча музыканта, дырыжора, яна дае найбольш поўнае ўяўленне аб прафесійных якасцях таго ці іншага выканаўцы. Водгукі і рэцэнзіі на канцэрты даюць падставы гаварыць аб тым, што ў асобе К.А.Сімяонава філарманічныя аркестравыя калектывы атрымалі добра адукаванага, сур'ёзнага музыканта-прафесіянала, які не толькі з поспехам выконваў ролю другога дырыжора сімфанічнага аркестра, але і вельмі старанна, з вялікім жаданнем і натхненнем працаваў у якасці галоўнага дырыжора аркестра беларускіх народных інструментаў.

Дзейнасць на Беларусі К.А.Сімяонава супала з надзвычай плённымі гадамі ў развіцці беларускага музычнага мастацтва. Канец 30-х гадоў звязаны з выпускам Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі (1937 г.), у якім былі і першыя выпускнікі класа В.Залатарова кампазітары А.Багатыроў, М.Крошнер, П.Падкавыраў. У гэты час з'явіліся новыя творы беларускіх кампазітараў для сімфанічнага аркестра, камернага ансамбля, беларускага аркестра народных інструментаў, хору, салістаў-інструменталістаў, вакалістаў. Сталі традыцыйнымі паказы дасягненняў нацыянальных літаратуры і мастацтва розных рэспублік Савецкага Саюза ў Маскве. У 1940 г. было вырашана правесці Дэкаду беларускага мастацтва. Уся рэспубліка рыхтавалася да гэтай знамянальнай і важнай падзеі. Рэпеціраваліся спектаклі ў оперным тэатры; праглядаліся партытуры новых твораў беларускіх кампазітараў, каб адабраць лепшыя для паказу; старанна вывучаўся кожны канцэртны нумар беларускага аркестра народных інструментаў, "з якім нястомна рэпеціраваў дырыжор К.Сімяонаў" (11). Вялікія надзеі ў падрыхтоўцы да Дэкады ўскладаліся на

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

Беларускую дзяржаўную філармонію, у прыватнасці, на Беларускі аркестр народных інструментаў, які меў характэрнае арыгінальнае гучанне, не падобнае ні на адзін з відаў народных аркестраў.

Калектыў з годнасцю прадставіў беларускае музычнае мастацтва, паказаў, што мае магчымасці выканання найбольш складаных на той час аркестравых твораў, музычная мова якіх мела яркія нацыянальныя рысы. Сярод твораў былі "Фантазія на беларускія тэмы" Г.Самохіна і сімфаньета "Беларускія малюнкі" М.Чуркіна. Гэтыя творы атрымалі прызнанне дзякуючы сваёй меладычнасці, выразнасці формы, кампазітарскаму майстэрству. І сёння сімфаньета "Беларускія малюнкі" старэйшага беларускага кампазітара па праву лічыцца ўзорам нацыянальнай музычнай класікі.

У прэсе з'явіліся водгукі на падзеі ў Маскве: "Аркестр народных інструментаў прадэманстраваў асаблівыя якасці, перш за ўсё вялікія аркестравыя магчымасці, маляўнічасць і майстэрскае выкананне. ... З вялікім тэмпераментам правёў сваю праграму дырыжор аркестра К.Сімяонаў" (12). "На заключным канцэрце кожны нумар праграмы выклікаў гарачыя апладысменты, а некаторыя творы па патрабаванні слухачоў даводзілася бісіраваць. Так было з фіналам Сімфаньеты М.Чуркіна, які выконваўся аркестрам беларускіх народных інструментаў"(13).

Значны творчы рост Беларускага аркестра народных інструментаў звязаны з дзейнасцю К.А.Сімяонава. Дырыжор шмат зрабіў для развіцця выканальніцкага майстэрства аркестра ў перыяд падрыхтоўкі да першай Дэкады беларускага мастацтва ў Маскве. Вядомы ў той час беларускі кампазітар М.Шчаглоў адзначаў: "Малады калектыў аркестра народных інструментаў, які меў напачатку выгляд самадзейнай адзінкі, за апошнія гады дзякуючы сістэматычнай вучобе і кіраванню дырыжора Сімяонава і кампазітара Самохіна, вырас у цікавы нацыянальны мастацкі калектыў" (14). Таму не выпадкова аркестр заняў трывалае месца ў мастацкай і музычнай культуры Беларусі. Інтэлектуальны ўзровень сімфанічнага дырыжора дазволіў накіраваць аркестр на шлях сапраўднага прафесіяналізму, дасягнуць творчых вяршынь, дагэтуль невядомых. Аркестр пад кіраўніцтвам К.А.Сімяонава ўзняўся на якасна новую ступень ён стаў творчым калектывам, здольным рашаць складаныя творчыя задачы. Па сутнасці, К.А.Сімяонаў быў першым прафесійным

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дырыжорам беларускага аркестра народных інструментаў і ў даваенны перыяд адыграў асноўную накіравальную ролю ў развіцці народнага аркестравага мастацтва на Беларусі.

Не проста склаўся далейшы лёс гэтага цудоўнага музыканта і дырыжора. З першых дзён вайны К.Сімяонаў стаў звычайным салдатам, а пасля цяжкай кантузіі трапіў у нямецкі палон. У лагеры на долю вязня № 318 выпала нямала выпрабаванняў, і толькі ў студзені 1945 г. ён здолеў уцячы. Некалькі ваенных гадоў не перашкодзілі К.Сімяонаву ў 1946 г. атрымаць першую прэмію на Усесаюзным аглядзе маладых дырыжораў у Ленінградзе. Гэты факт сведчыць аб высокіх прафесійных якасцях музыканта, творчы патэнцыял якога, нягледзячы на жыццёвыя складанасці, раскрыўся на новым узроўні. А.Гаўк у сваіх успамінах пісаў, што для К.Сімяонава былі характэрныя рамантычная насычанасць, шырокі размах эмоцый, валявы імпульс, тонкае адчуванне музыкі, уменне данесці да слухача форму музычнага твора (15). Усе гэтыя рысы і якасці ў будучым дазволілі таленавітаму музыканту і дырыжору атрымаць званне народнага артыста СССР (16).

Другі сімфанічны дырыжор, з творчасцю якога звязана дзейнасць Дзяржаўнага народнага аркестра, — заслужаны дзеяч мастацтваў РСФСР Віктар Наумавіч Барсаў. 60-я гады для аркестра — гэта гады сталасці, прызнання калектыву не толькі ў нашай дзяржаве, але і за мяжой, гады шматлікіх гастроляў, творчых поспехаў. Да гэтага часу аркестр стаў адным з вядучых творчых калектываў Беларусі. Калектыў — удзельнік дзвюх Дэкад беларускага мастацтва ў Маскве (1940 г. і 1955 г.), Усесаюзнага фестывалю моладзі ў 1957 г. (дзе атрымаў залаты медаль), пераможца Усесаюзных фестываляў тэатраў і музычных калектываў.

Высокі ўзровень выканальніцкага мастацтва аркестра ў 50 — 60-я гады звязаны з творчасцю народнага артыста СССР, мастацкага кіраўніка І.І.Жыновіча, які вызначаў асноўны накірунак развіцця калектыву. Але адначасова з І.Жыновічам заўсёды працавалі дырыжоры, уклад якіх у развіццё народнага аркестра заслугоўвае асобай адзнакі: у пасляваенныя гады — М.Рыўкін, пазней — В.Барсаў, С.Ратнер, Г.Алоўнікаў.

В.Н.Барсаў на некалькі гадоў (1958 — 1965) звязаў свой творчы лёс з Беларуссю, з Беларускім аркестрам народных інструментаў. Дзякуючы архіўным пошукам нам удалося знайсці даволі падрабязныя звесткі аб жыццёвым і творчым шляху В.Барсава. Так, стала вядома, што Віктар

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Навумавіч Барсаў нарадзіўся 2 лютага 1928 г. у Палтаве. Вучыўся ў Харкаўскім музычным вучылішчы, а з 1945 г. – у Харкаўскай кансерваторыі на фартэпіянным факультэце. Пасля яго заканчэння быў накіраваны на работу ў г. Драгобыч у музычнае вучылішча ў якасці выкладчыка. Там жа адзін сезон працаваў дырыжорам абласнога музычнага драматычнага тэатра. Адначасова В.Барсаў вучыўся на дырыжорскім факультэце Львоўскай кансерваторыі. У 1952 г. па сямейных абставінах пакінуў работу і вучобу ў Заходняй Украіне і вярнуўся ў Харкаў, дзе працаваў выкладчыкам у музычнай дзесяцігодцы і канцэртмайстрам у кансерваторыі. У школе ён выкладаў спецыяльнае фартэпіяна і з'яўляўся кіраўніком школьнага сімфанічнага аркестра. У гэты час В.Барсаў выконваў таксама і абавязкі дырыжора-асістэнта ў опернай студыі кансерваторыі. З 2 ліпеня 1958 г. залічаны на работу ў якасці дырыжора аркестра народных інструментаў Белдзяржфілармоніі (17). З гэтага часу пачалася плённая творчая дзейнасць В.Барсава на Беларусі.

У архіўных дакументах у даведцы аб рабоце Дзяржаўнага народнага аркестра БССР знаходзім сціплы запіс: "У апошнія гады з аркестрам усё так жа плённа працуе дырыжор Віктар Барсаў" (18). Старэйшы беларускі мастацтвазнаўца Б.С.Смольскі ў інтэрвью адзначыў, што І.І.Жыновіч заўсёды быў мастацкім кіраўніком народнага аркестра, а менавіта на дырыжора ўскладаліся абавязкі ажыццяўлення складанага рэпетыцыйнага працэсу, арганізацыйнай работы, і, безумоўна, на плячах яго ляжала асноўная канцэртная дзейнасць. Пад кіраўніцтвам В.Н.Барсава аркестр падняўся на якасна новы прафесійны ўзровень. Гэта быў сапраўдны творчы калектыў, які адпавядаў вельмі высокім патрабаванням прафесійнага аркестра.

Трэба адзначыць, што В.Барсаў вельмі актыўна ўдзельнічаў у фарміраванні рэпертуару аркестра. Гэтаму пытанню ён не выпадкова надаваў асаблівае значэнне, бо быў перакананы, што менавіта ад рэпертуару залежаць творчае аблічча і далейшае развіццё такога спецыфічнага калектыву, як Беларускі аркестр народных інструментаў. У прэсе 60-х гадоў можна сустрэць артыкулы за подпісам дырыжора В.Барсава, дзе выказваліся думкі аб неабходнасці пашырэння тагачаснага рэпертуару аркестра, які ўключаў у сябе тры раздзелы: апрацоўкі і пераклады беларускіх народных песень і танцаў, музычны фальклор іншых народаў; пераклады класічных твораў; арыгінальныя творы

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

беларускіх кампазітараў. Недахоп беларускай музыкі адчуваўся вельмі востра, дырыжор лічыў, што беларускія кампазітары "недаацэньваюць мастацкія магчымасці народнага аркестра, лічаць, што сур'ёзныя музычныя задачы яму не пад сілу, што сфера яго выканаўчай дзейнасці не распаўсюджваецца далей невялікіх п'ес не вельмі глыбокага зместу". А між тым аркестр "у стане данесці да слухачоў глыбіню і веліч твораў Баха і героіку "Эгманта" Бетховена, лёгкасць і прывабнасць уверцюр Расіні і драматызм п'есы Барадзіна "У манастыры", лірызм і прывабную прыгажосць вальсаў М.І. Глінкі і П.І. Чайкоўскага" (19).

Лейтматывам у артыкулах В.Барсава праходзіла думка аб галоўным прызначэнні беларускага аркестра народных інструментаў — перш-наперш развіваць і прапагандаваць творы айчынных кампазітараў, якія павінны складаць аснову рэпертуару (20). З вялікім задавальненнем і натхненнем ён выконваў новыя творы. Шмат партытур беларускіх кампазітараў упершыню апынуліся ў руках гэтага неабыякавага музыканта (21).

У архіўных матэрыялах знаходзім звесткі аб удзеле В.Н.Барсава ў пасяджэнні музычна-рэпертуарнай камісіі Міністэрства культуры БССР у лістападзе 1960 г., дзе разглядаліся творы Я.Цікоцкага і І.Ронькіна. Менавіта В.Барсаў даў высокую ацэнку "Варыяцыям на беларускія тэмы". Гэта адыграла станоўчую ролю ў рашэнні камісіі: "Варыяцыі" Я.Цікоцкага і канцэрт для двух цымбалаў І.Ронькіна былі рэкамендаваны да набыцця для народнага аркестра (22). З гэтага моманту пачалося творчае жыццё новых твораў. Музыказнаўца Д.Жураўлёў адзначае паспяховае першае выкананне пад кіраўніцтвам В.Барсава канцэрта для двух цымбалаў з аркестрам маладога кампазітара І.Ронькіна і "Варыяцый на беларускія тэмы" Я.Цікоцкага (23). Канцэрт І.Ронькіна ў той час выконваўся з поспехам у розных залах і нават гучаў у Крамлі, быў запісаны на пласцінку Усесаюзным домам гуказапісу.

Належнае месца ў рэпертуары аркестра народных інструментаў займалі пераклады сімфанічных твораў рускіх і заходнееўрапейскіх кампазітараў. В.Барсаў на старонках газеты "Літаратура і мастацтва" ўступае ў палеміку з тымі, хто ставіў пытанне аб правамернасці выканання ў народным аркестры пералажэнняў і аранжыровак, хто лічыў, што, выконваючы сімфанічную музыку, народны аркестр губляе свой стыль і непасрэднасць, а гучанне аркестра набліжаецца да сімфанічнага. В.Барсаў у артыкуле "Слова ў спрэчках" падкрэслівае: калі "маштабы гучання

разрастаюцца, набліжаюцца да гучання сімфанічнага аркестра, то гэтага ніяк нельга аднесці да ліку недахопаў. Сімфанічнае гучанне сведчыць аб вялікіх магчымасцях народных інструментаў, аб майстэрстве выканаўцаў, якія на іх іграюць" (24). На думку дырыжора, пераклады сімфанічных партытур, якія ўключаліся ў рэпертуар аркестра, у праграмы канцэртаў, дэманстравалі прафесійнае майстэрства і выканальніцкія магчымасці народных інструментаў. Акрамя гэтага, аркестр садзейнічаў распаўсюджванню класічнай музыкі сярод самых шырокіх мас слухачоў.

В.Барсаў — таленавіты музыкант, з добрай інтуіцыяй, яскравым тэмпераментам і дырыжорскай воляй. Ён разам з народным артыстам СССР І.Жыновічам з годнасцю прадстаўляў беларускае мастацтва на шматлікіх гастролях па ўсёй краіне, з поспехам праводзіў канцэрты. Водгукі тых гадоў сведчаць аб узроўні аркестра і іх кіраўнікоў. "Трактоўка твораў дырыжорам В.Барсавым тэмпераментная, дынамічная..." — адзначалася ў 1963 г. пасля гастроляў Дзяржаўнага народнага аркестра па Казахстане (25).

З вялікім поспехам прайшлі канцэрты аркестра ў Ленінградзе, дзе былі выкананы творы беларускіх кампазітараў М.Чуркіна і Я.Глебава. У прэсе з'явіўся водгук на праграму, якая прагучала пад кіраўніцтвам В.Барсава: "...строга, з тонкім пачуццём стылю выконвае аркестр "Сіцыліяну" Баха, бліскуча і тэмпераментна былі сыграны уверцюра Расіні "Сарока-зладзейка" і сюіта Кабалеўскага "Камедыянты". Аўтар артыкула, які характарызаваў дырыжораў, адзначае "вялікі вопыт мастацкага кіраўніка аркестра, народнага артыста БССР І.Жыновіча, гарачы тэмперамент і захопленасць В.Барсава" (26). Трэба дадаць, што абодва яны паспяхова забяспечвалі творчае развіццё мастацкага калектыву.

Акрамя творчай дзейнасці, выканальніцкі вопыт і эрудыцыя дазвалялі музыканту выступаць не толькі ў ролі дырыжора беларускага аркестра народных інструментаў. На старонках газеты "Літаратура і мастацтва" чытаем музыказнаўчыя артыкулы В.Барсава, прысвечаныя розным падзеям музычнага жыцця рэспублікі. Дзякуючы гэтаму боку дзейнасці ў перыядычным друку знайшлі адлюстраванне крытычныя матэрыялы, якія змяшчаюць у сабе музыказнаўчы аналіз выступлення вядомага піяніста Даніэла Полака (27), канцэртаў духавога аркестра Мічыганскага універсітэта (28), японскай скрыпачкі Іёка Куба (29). Трэба падкрэсліць, што крытычнае асэнсаванне творчых працэсаў у выканальніцкім

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мастацтве было характэрна для дырыжора яшчэ ў 50-я гады. У архіўных матэрыялах ёсць звесткі аб працы В.Барсава ў якасці рэцэнзента ў абласных газетах Драгобыча і Харкава (30).

На жаль, у 1965 г. В.Барсаў пакінуў Беларусь, а сваё творчае майстэрства далей развіваў як дырыжор-сімфаніст. Працуючы з рознымі сімфанічнымі аркестрамі, ён, як і раней, быў прапагандыстам сучаснай айчыннай і замежнай музыкі і, безумоўна, выконваў творы, якія ўвайшлі ў скарбніцу сусветнай музычнай культуры.

У 1982 г. В.Барсаў, які ў той час быў галоўным дырыжорам Яраслаўскага сімфанічнага аркестра, па запрашэнні Беларускай філармоніі прыехаў на Беларусь. На адкрыцці новага сезона Гомельскай філармоніі пад яго кіраўніцтвам прагучала праграма з твораў П.І.Чайкоўскага: 4-я сімфонія, канцэрт №1 для фартэпіяна з аркестрам і вакальныя творы. А.Еўтуховіч, які добра ведаў В.Барсава, шмат з ім працаваў, адзначае высокае майстэрства дырыжора, яго сталасць, удумлівасць, што характэрна для ўсёй творчасці гэтага таленавітага музыканта: "Дакладныя, упэўненыя рухі, адметны тэмперамент, цудоўнае веданне партытуры. Адчуваецца, што з цягам часу дырыжор стаў больш строгі і стрыманы. Гады работы над выкананнем сімфоніі прывялі да новай трактоўкі, больш стрыманай, больш блізкай да аўтарскай задумкі" (31).

Відавочна, што дасягнутыя вяршыні майстэрства прафесійнай дзейнасці дырыжора не выпадковыя. Творчы рост Дзяржаўнага аркестра народных інструментаў у 60-я гады, яго няспынныя поспехі звязаны з плённай працай таленавітага музыканта В.Барсава, які асноўны накірунак развіцця аркестра бачыў у прапагандзе беларускай музыкі, твораў беларускіх кампазітараў, у развіцці сімфанічнага акадэмічнага мыслення аркестрантаў.

У артыкуле мы паспрабавалі высветліць менш вядомыя бакі дырыжорскай дзейнасці музыкантаў, якія значна ўплывалі на развіццё не толькі Дзяржаўнага народнага аркестра, але і ўсяго народна-інструментальнага выканальніцтва. У публікацыях часцей за ўсё даюцца характарыстыкі выканальніцкага ўзроўню аркестравага калектыву ці асобнага дырыжора, ідуць пералік выкананых твораў і канстатацыя некаторых фактаў. На наш погляд, актуальнай з'яўляецца праблема ўзаемасувязі народна-інструментальнага выканальніцтва і дырыжорскага мастацтва, аб чым яскрава сведчыць дзейнасць вышэйадзначаных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дырыжораў. Толькі ўзаемаўзбагачэнне можа прынесці станоўчыя вынікі. Дзейнасць дырыжора і аркестра трэба разглядаць у іх арганічным адзінстве. Зразумела, што сапраўднае мастацтва як з'ява самабытная і арыгінальная можа ўзнікнуць у выніку творчага і духоўнага ўзаемапранікнення дырыжора і аркестра, у сумесным разуменні твора, які выконваецца, у прамой і зваротнай сувязі кіраўніка і калектыву музыкантаў.

Тут трэба дадаць, што на якасць мастацкага выканання ўплываюць асоба дырыжора, ступень далучэння яго да вышэйшых дасягненняў агульначалавечай культуры, якасць яго музычных здольнасцей. Разам з тым важным з'яўляецца і індывідуальнае майстэрства кожнага музыканта ў аркестры. Таму можна зрабіць выснову, што калектыўнае выкананне ажыццяўляецца ва ўзаемадзеянні з дырыжорам, пад уздзеяннем яго асобы і прафесійнага майстэрства.

---

1. Александров А. Государственному народному аркестру БССР — 40 лет //Советская Белоруссия. — 1970. — 23 дек.
2.Яканюк Н. Аркестр цымбал, жалеек і ліp //Мастацтва Беларусі. — 1984. — N9. — С.70.
3.Александроўская Л. Залатыя струны //Літ. і мастацтва. — 1969. — 18 сак.
4. Там жа.
5. Літаратура і мастацтва. — 1937. — 31 кастр.
6. Літтаратура і мастацтва. — 1938. — 10 мая.
7.Богуславский С. // Сов. Белоруссия. — 1938. — 15 мая.
8. Літаратура і мастацтва. — 1938. — 10 крас.
9. Цыт. па кн.: Загородний Г. Музыки высокое призвание. — Мн., 1988. — С.26.
10 Шчаглоў М. Дэкада рускай класічнай музыкі // Літ. і мастацтва. — 1938. — 6 крас.
11. Загородний Г. Музыки высокое призвание. — Мн., 1988. — С.35.
12. Аляксандраў А. Заключны канцэрт беларускай дэкады //Літаратура і мастацтва. - 1940. — 23 чэрв.
13. ЦДАМЛМ Рэспублікі Беларусь. Ф.341, воп.1, спр.9, л.11.
14.Шчаглоў М. Беларуская філармонія //Літаратура і мастацтва. — 1940. — 5 чэрв.
15. Григорьев Л., Платек Я. Современные дирижеры. — М., 1969. — С.246.
16. Музыкальная энциклопедия. — М., 1978. — Т.4. — С.970 — 971.
17. Архіў БДФ. Ф.1, воп.3, спр.34, л.160 — 161.
18. ЦДАМЛМ РБ. Ф.114, воп.1, спр.211, л.30.
19. Барсаў В.Слова да кампазітараў //Літаратура і мастацтва. — 1960. — 23 жн.
20. Барсаў В.Добры пачатак //Літаратура і мастацтва. — 1961. — 16 чэрв.
21. Барсаў В.У садружнасці з кампазітарамі //Літаратура і мастацтва. — 1961. — 3 кастр.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

22. НА РБ. Ф.974, воп.2, спр.23, л.14.
23. Жураўлёў Д. //Літаратура і мастацтва. — 1960. — 9 снежня.
24. Барсаў В. Слова ў спрэчках //Літаратура і мастацтва. — 1959. 4 ліп.
25. ЦДАМЛМ РБ. Ф.114, воп.1, спр.224, л.17.
26. Полферов И.Большой и заслуженный успех //Советская Белоруссия. — 1961. — 1 марта.
27. Барсаў В.Канцэрты Д.Полака //Літаратура і мастацтва. — 1961. — 10 студз.
28. Барсаў В. Госці са Злучаных Штатаў //Літаратура і мастацтва. — 1961. — 14 сак.
29. Барсаў В. Іграе Іёка Куба //Літаратура і мастацтва. — 1962. — 24 крас.
30. Архіў БДФ. Ф.1, воп.3. спр.34, л.161.
31. Еўтуховіч А. Дырыжыруе Віктар Барсаў //Гомельская праўда. — 1982. —14 кастр.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ